# Сустрэча кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР таварыша П. К. Панамарэнкі з выбаршчыкамі

Велізарная зала клуба Мінскага аўтамабільнага завода перапоўнена. На сустрэчу са сваім кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай ССР таварышом Панцеляймонам Кандратавічам Панамарэнкам прышло больш тысячы рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых завода.

Сход адкрывае сакратар партыйнага бюро завода тав. Малін. Пад бурныя, доўга не змаўкаючыя апладысменты выбіраецца ганаровы прэзідыум у складзе Палітбюро ЦК ВКП(б) на чале з вялікім Сталіным.

Першае слова прадастаўляецца даверанаму тав. Найдзёнаву.

— Таварышы выбаршчыкі! — гаворыць ён. — З найвялікшым палітычным і вытворчым уздымам рыхтуецца беларускі народ да выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі і асабіста таварыша Сталіна паспяхова ідзе аднаўленне разбуранай ворагам народнай гаспадаркі рэспублікі. Ужо адноўлены і даюць прадукцыю больш 6.000 прамысловых прадпрыемстваў. Ствараюцца новыя галіны прамысловасці — аўтамабільная, трактарная, магутная энергетычная база. Значныя поспехі дасягнуты і ў сельскай гаспадарцы. Велізарная ўвага аддаецца павышэнню матэрыяльнага і культурнага дабрабыту працоўных.

...чых урнаў і аддадзім свае галасы за нашага дастойнага кандыдата, вернага сына народа і большэвіцкай партыі Панцеляймона Кандратавіча Панамарэнку!

На трыбуне стаханавец інструментальнага цэха тав. Балашэвіч. Ён гаворыць:

— Набліжаецца ўсенароднае свята— дзень выбараў у Вярхоўны Совет Беларусі. Аднадушна галасуючы за кандыдатаў сталінскага блока камуністаў і беспартыйных, мы будзем галасаваць за далейшае працвітанне нашай магутнай сацыялістычнай Радзімы, за нашу родную большэвіцкую партыю, за нашага вялікага правадыра і настаўніка, лепшага друга беларускага народа таварыша Сталіна.

У дзень выбараў мы з радасцю аддадзім свае галасы за нашага дастойнага кандыдата—за Панцеляймона Кандратавіча Панамарэнку. Велізарныя заслугі таварыша Панамарэнкі ў росквіце нашай рэспублікі за гады мірнага сацыялістычнага будаўніцтва і ў вызваленні яе ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Цяпер, у мірных умовах, таварыш Панамарэнка ўсе сілы і энергію аддае справе хутчэйшага аднаўлення народнай гаспадаркі і культуры Беларусі.

Заклікаю ўсіх выбаршчыкаў 9 лютага сталінскага блока комуністаў і беспартыйных тав. Панамарэнку. Зала адказвае на гэты заклік бурнымі апладысментамі.

Слова атрымлівае інжынер тав. Дзёмін, які гаворыць:

— Шпаркімі тэмпамі ідзе аднаўленне народнай гаспадаркі нашай роднай Беларусі. Адноўлены і працуюць тысячы прадпрыемстваў, якія былі разбураны ворагам. Адноўлены ўсе калгасы. Пабудавана 254 тысячы дамоў для калгаснікаў. Гэта дасягнута дзякуючы сталінскім клопатам аб беларускім народзе. Нямалая доля працы тут і нашага кандыдата тав. Панамарэнкі.

Зараз мы ўступілі ў самы адказны перыяд будаўніцтва завода—гэтага гіганта новай пасляваеннай пяцігодкі. Мы ўпэўнены, што сваёй стаханаўскай працай, пры штодзённай дапамове нашага кандыдата тав. Панамарэнкі з часцю справімся з задачай стварэння Мінскага аўтазавода. Мы, рабочыя, майстры, інжынерна-тэхнічныя работнікі завода, прыкладзем усе сілы для выканання задачы, пастаўленай таварышом Сталіным аб паскарэнні тэмпаў аднаўленчых работ. За гэтую высокародную задачу, за родную партыю большэвікоў, за нашу вялікую Радзіму, за мудрага Сталіна мы будзем галасаваць 9 лютага, аднадушна аддаючы свае галасы за віднага дзеяча нашай партыі, вернага сталінца Панцеляймона Кандратавіча Панамарэнку. **(Апладысменты).**

Ад комуністычнай арганізацыі Сталін...

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы